Падтрымай "Вясну" на PATREON

Міліцыя закасала рукавы: будуць складаць пратаколы за Дзень вайсковай славы дапоўнена

14.09.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Дзень беларускай вайсковай славы ў Мінску 8 верасня 2017 года. Фота: #controlBY

Удзельнікі акцыі папярэджання і мітынгу ў Мінску 8 верасня, прымеркаваных да Дня беларускай вайсковай славы, атрымалі выклікі ў аддзяленні міліцыі для складання пратаколаў правапарушэння па арт 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве).

У сацыяльных сетках паведамляецца, што сустаршыню аргкамітэта па стварэнні БХД **Паўла Севярынца** выклікалі на 15 верасня у Цэнтральнае РУУС Мінска ў сувязі з яго ўдзелам у сталічнай акцыі супраць беларуска-расейскіх вучэнняў „Захад-2017", якая прайшла 8 верасня.

> Выклікаюць у Цэнтральны райаддзел за акцыю 8 верасьня. Павестку даслалі бацькам у Віцебск. Каму яшчэ прыслалі - паведамляйце, сябры.
>
> Павел Севярынец


У Савецкім РАУСе чакаюць 15 верасня актывіста “Еўрапейскай Беларусі” **Леаніда Кулакова,** а таксама аднаго з фігурантаў справы “аб падрыхтоўцы масавых беспарадкаў” **Сяргея Кунцэвіча,** сустаршыню руху салідарнасці «Разам» **Алену Талстую** (Цэнтральны РУУС),актывіста руху салідарнасць «Разам» **Алеся Макава.** Іх прысутнасць таксама зафіксавалі на Кастрычніцкай плошчы сталіцы.

На актывіста кампаніі «Альтэрнатыва» **Дзмітрыя Сільчанку** будуць складаць пратакол таксама 15 верасня. Вядома, што ў міліцыю выклікаюць **Вячаслава Сіўчыка** і **Антося Жылко** (Партызанскі РАУС). Па ягоных словах, за 8верасня праходзіць апроч ягго яшчэ 7 чалавек.


Tut.by паведамляе таксама, што выклік у Цэнтральны РУУС Мінска на 14 гадзін з нагоды ўдзелу ў акцыі прыйшоў яшчэ актывістцы **Грэце Сабалеўскай**. Апошняя разам з некалькімі іншымі ўдзельнікамі акцыі трымала вялікі бел-чырвона-белы сцяг. Яна пазней была затрыманая на плошчы Якуба Коласа для праверкі дакументаў.
Дарэчы, па інфармацыі mspring.online, суд Ленінскага раёна Магілёва 13 верасня прызнаў актывіста апазіцыі **Станіслава Паўлінковіча** вінаватым ва ўдзеле ў несанкцыянаванай акцыі, якая прайшла 8 верасня ў Мінску. І аштрафаваў яго ў адпаведнасці з ч. 1 арт. 23.34 КоАП (парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавых мерапрыемстваў) на 20 базавых велічынь (460 рублёў). Актывіст быў затрыманы ўвечары 10 верасня па месцы працы ў Магілёве і ноч правёў у ізалятары часовага ўтрымання.

Твитнуть









Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул


"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ


Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

CC BY